Рэгіна Гамзовіч, грамадскі эксперт у сферы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, філолаг, журналіст, г. Мінск.

# “ПАГОСТ — КРАЙ ЦУДАЎ”

Многія з тых, хто нарадзіўся і жыў у вёсцы Пагост, раз’ехаліся ў розныя мясціны Беларусі і за яе межы не таму, што яны абыякавыя да лёсу роднага кута. Якраз наадварот: увекавечылі і праславілі яго сваёй працай, атрымаўшы вышэйшую адукацыю, навуковыя званні, дзяржаўныя ўзнагароды, апісалі яе старажытную гісторыю і адметную этнічную культуру (1, 2). Былі і ёсць сярод іх людзі розных прафесій, якія бралі і бяруць прыклад у жыцці і працы са сваіх продкаў. А тыя нават дэманстравалі свае дасягненні ў 30-я гады і ў 1941 годзе перад самай вайной на выставе ВДНГ у Маскве. Раз’ехаліся пагашчане ў пошуках працы і адукацыі, бо вёсачка іх невялікая, а ў сельскай гаспадарцы ручную працу замянілі машыны — непатрэбна на зямлі столькі працаўнікоў, як раней. Каб не згубіцца па-за межамі малой Радзімы, не забыцца пра яе даўнюю гісторыю і багатую этнічную культуру, пагастчане стварылі сайт у Інтэрнеце “Пагост — край цудаў”. І не памыліліся з назвай — вёска сапраўды праславіся ў свеце і дагэтуль захоўвае свае цудоўныя адметнасці.

1. Саскевіч Мікола Аляксеевіч (1945-2020)— кандыдат фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі НАН Беларусі, сакратар праўлення ГА “Тураўскае навукова-асветнае таварыства”, краязнавец, які выдаваў за свой кошт бюлітэнь гэтага таварыства “Тураўшчына: мінулае, сучаснасць, будучыня”. Мецэнат, які аказваў фінансавую падтрымку мясцоваму храму і калектыву “Міжрэчча”, арганізаваў вяртанне ў Пагост з Гомельскага музея святыні мясцовых жыхароў — цудатворнага каменнага крыжа, які старыя называлі “Часны крэст”.
2. Кузьміч Міхаіл Пятровіч (1950-2021), адміністрацыйны работнік і выкладчык ВНУ, кандыдат філасофскіх навук і член Саюза пісьменнікаў пакінуў нашчадкам летапіс роднай вёскі “Мой Пагост”, выдадзенай у Віцебску ў 2020 годзе.




Заснаваная ў месцы ўпадзення ракі Сцвігі ў Прыпяць, вёска Пагост займае невялікую тэрыторыю і размешчана як бы на паўвостраве, пасярэдзіне якога ў самы цэнтр вядзе пратока Тур, якая праз Сцвіжанец і Бур’яку звязвае гэтыя рэкі ва ўрочышчы Рагі. З якой мэтай узведзены гэтыя яўна рукатворныя пратокі, стала зразумела пасля таго, як у гэтым месцы былі праведзены археалагічныя раскопкі і выяўлены цікавыя артэфакты, калі адбыліся раскопкі на Туравай Гары, а лінгвісты Акадэміі навук Беларусі стварылі 5-томны “Тураўскі слоўнік” і “Атлас тураўскіх гаворак”, растлумачылі паходжанне назвы вёскі Пагост.

У друкаваных крыніцах Пагост упамінаецца пад 1520 годам, калі князь Канстанцін Астрожскі, які валодаў гэтай вёскай, перадаў яе ва ўласнасць Тураўскаму Свята Успенскаму сабору. Аднак археолагі выявілі тут паселішча яшчэ мілаградскай культуры канца бронзавага —

пачатку жалезнага веку са шматлікімі артэфактамі, бескурганны могільнік, а таксама знаходкі часу зарубінецкай культуры (другая палова III тысячагоддзя да нашай эры – пачатку II стагоддзя нашай эры) — усё захоўваецца ў Тураўскім краязнаўчым музеі.










Паселішчы, выяўленыя ва ўрочышчах Панскае Поле і Сырэц, Вузкае і Грабелька на захад ад вёскі, а таксама могільнік у яе паўночнай частцы, вядомыя жыхарам Пагоста з даўніх часоў. Насельніцтва гэтай і навакольных з Туравам вёсак належыць да старажытных індаеўрапейцаў, яно аўтахтоннае, ніколі нікім не заваёўвалася, не асімілявалася ў перыяд, калі складаліся агульныя этнічныя асаблівасці, а таксама і ў далейшым — дзякуючы адасобленасці з-за веснавых паводкаў шматлікіх рэк, забалочанасці і густога ляснога масіву на поўдні.

Адметна тое, што ў мясцовых паданнях Пагост упамінаецца яшчэ да заснавання горада Турава, бо да прыходу на гэтыя землі князя Тура існаваў вялізны дрыгавіцкі пратагорад Хіль, які цягнуўся ад Пагоста да Аздаміч (Аздамічы – вёска ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці, а ад былой назвы Хіль засталася вёска Хільчыцы). Ды і старажылы Пагоста заўсёды былі ўпэўнены: “Пагост снаваўса (быў заснаваны) раней за Тураў”. Цікава тое, што Тураў склаўся як рэзідэнцыя князя на Туравай гары, уключаючы навакольныя вёскі, назвы якіх дагэтуль сведчаць пра іх прызначэнне. Такім чынам, горад Тураў, як і яго папярэднік Хіль, займаў вялікую тэрыторыю.

Пра першапачатковую функцыю месца, дзе была заснавана вёска Пагост, сведчыць яе назва: пагост – месца збору палюддзя (штогадовай даніны князю), як тлумачаць яе вучоныя. Вядома, што пагосты засноўвала і ўстанаўлівала каля іх каменныя крыжы кіеўская княгіня Вольга, якая першай сярод рускіх князёў прыняла хрысціянскую веру і распаўсюджвала яе на падуладных Кіеву землях. Падзел паселішчаў на пагосты быў спынены толькі ў 1775 годзе.



Вялікая кіеўская княгіня Вольга кіравала Кіеўскай Руссю з 945 да 960 года ў якасці рэгента пры малалетнім сынеСвятаславе,пасля гібелі яе мужа, кіеўскага князя Ігара Рурыкавіча. Яна першай з кіраўнікоў Русі прыняла хрысціянства і прызнана святой роўнаапостальнай Рускай праваслаўнай царквы.

Заснаваная ў месцы збору палюддзя, вёска Пагост з цягам часу стала адміністрацыйным, рэлігійным і гандлёвым цэнтрам. Менавіта на гэтай тэрыторыі на правабярэжжы Прыпяці ў міжрэччы Сцвігі і Гарыні склаўся з даўніх часоў лакальны этнарэгіён Усходняга Палесся — Тураўшчына. Аўтар энцыклапедычнага даведніка “Народная культура Беларусі” прафесар В.С. Цітоў падкрэслівае, што Тураўшчыну называлі “Малое Палессе”.

## *ТУРАЎШЧЫНА і вёска Пагост*




На першым плане вёска Пагост, прама – урочышча Рагі,
па баках злева Прыпяць, справа Сцвіга.



Рака Прыпяць — прыток Дняпра



Рака Сцвіга — прыток Прыпяці

Прыроднае асяроддзе Тураўшчыны, гэтага лесабалотнага рэгіёна, унікальнае, яно ўражвае мноствам азёр і балот, прыгожымі пойменнымі дубровамі, багаццем і разнастайнасцю расліннага і жывёльнага свету. У перыяд веснавых разліваў, калі праз гэтую тэрыторыю Прыпяцкага Палесся мігрыруе і прылятае сюды гняздзіцца мноства пералётных птушак, а ўсё наваколле заліта вадой, міжволі ўзгадваюцца ўражанні замежных вандроўнікаў, якія са старажытных часоў апісвалі гэтыя разлівы як мора, сярод якога на выспах размяшчаліся нешматлікія паселішчы.

Калісьці і мост праз Прыпяць для палешукоў быў новым.



А зараз з ышыні ён выглядае проста якскладачка. Сапраўднае мора Герадота!





Ускрайкам сусвету сярод гэтага мора падаецца вёска Пагост. Дзівосны краявід, праўда?





Нават у наш час можна назіраць у некаторыя гады вясной сляды гэтых спрадвечных разліваў.
На фота Сяргея Плыткевіча - разліў рэк Прыпяць і Сцвіга каля в. Пагост
у 2013 годзе — з альбома “Нечаканая Беларусь”.

Тураўшчына заўсёды вылучалася надзвычай урадлівымі глебамі, што было звязана з угнаеннем яе сапрапелямі падчас разліваў рэк. Жывёлагадоўля, птушкагадоўля, земляробства дапаўняліся для насельнікаў гэтага краю ляснымі і лугавымі промысламі – кошканнем (збіраннем яек дзікіх вадаплаўных птушак вясной), збіраннем грыбоў і ягад, лекавых траў і карэння, рыбалоўствам, паляваннем, бортніцтвам. Гэтая тэрыторыя, заселеная дрыгавічамі, мела свае пратагарады з акольнымі сёламі, якія забяспечвалі гараджан усім неабходным. Акружаныя частаколам з крамлёных дрэў, гарады абаранялі ад захопнікаў, былі цэнтрамі рамёстваў, гандлю і рэлігіі. Былі такія і на Тураўшчыне яшчэ да заснавання Турава.

## *Тураў і адметныя этнічныя рысы жыхароў Тураўшчыны*



Упершыню ў пісьмовых крыніцах Тураў упамінаецца пад 980 годам ў “Аповесці мінулых часоў”: “*Бѣ бо Рогъволодъ прішелъ и-заморыѧ имѧше власть свою в Полотьскѣ, а Туры Туровѣ, ѿ него же и Туровци прозвашасѧ*”. Князь Тур хутчэй за ўсё быў заклікaны на гэтыя землі мясцовымі жрацамі, але мэтаю полацкіх князёў было заснаванне на беразе ракі Прыпяць, прытоку Дняпра, горада, які б актывізаваў заходняе адгалінаванне воднага гандлёвага шляху “З варагаў у грэкі”, што садзейнічала б эканамічнаму развіццю. У сутоку рэк Язда і Струмень па ўсіх канонах жрэчаскай магіі быў збудаваны горад, які стаў цэнтрам старажытнага племяннога цэнтра дрыгавічоў, а затым і Тураўскага княства. Сляды закладзенай дрыгавічамі этнічнай еднасці развіваліся і пашыраліся з цягам часу, аднак іх рэшткі можна назіраць і ў XXI стагоддзі. Тураў як быў, так і застаўся невялікім горадам, які існуе ва ўнікальным прыродным асяроддзі, да якога мясцовыя жыхары прыстасаваліся і заўсёды выкарыстоўвалі на сваю карысць.



Набярэжная Турава у пачатку 20 стагоддзе



У вёсцы Пераоў непадалёк ад Пагоста жыве
адзіны ў Беларусі майстар, які вырабляе чаўны.
Фота Андрэя Катлярчука

Адзіным сродкам руху вясной быў **човен — лодка, выдзеўбаная з цэльнага камля дуба.** Затое ўлетку, калі вада спадала, пойменныя лугі давалі магчымасць карміцца на іх мноству жывёл і птушак. Таму можна верыць зноў-такі замежным гасцям, што менавіта на гэтай зямлі гадаваліся каровы незвычайнай пароды, за якімі прыплывалі, каб іх набыць, з далёкіх краёў. З якіх часоў на гэтай зямлі склаўся **культ быка тура**, невядома, але тое, што ён існаваў ў дахрысціянскі перыяд, безумоўна.

Інтэнсіўная вырубка лесу, а затым і бязмернае паляванне на яго, асабліва перад Грунвальдскай бітвай 1510 года — каб забяспечыць мясам агромністае войска, прывяло да таго, што ў каралеўскім лесе (Белавежская пушча) ў 1627 годзе быў забіты апошні тур. Аднак ён пакінуў пра сябе добрую памяць: усе свойскія быкі і каровы ў Еўропе — яго нашчадкі, а таксама вол — аблегчаны бык, прызначаны для працы на зямлі і перавозкі грузаў. Тур быў прыручаны ў дагістарычны час, але пазней, чым сабака і каза, свіння і авечка. Дзікі бык сімвалізаваў сонечны пачатак і плоднасць. Але аблегчаны бык страчваў значэнне сімвала плоднасці і станавіўся сімвалам месяца, бо яго рогі нагадвалі маладзік. Такі бык увасабляў фізічную сілу, цярплівую працавітасць і дабрабыт.

Многія народы свету ўшаноўвалі быка ў старажытныя часы, а некаторыя і зараз лічаць быка і карову свяшчэннымі жывёламі. Напрыклад, у Індыі ёсць самы вялікі ў свеце храм быка і помнік яму. Тое, што на Тураўшчыне захаваўся абрад “Карагод”, прысвечаны ўшанаванню быка тура, сведчыць, што на гэтай тэрыторыі жылі старажытныя індаеўрапейцы, якія памяталі пра свае карані, а іх нашчадкі данеслі гэта да нашага часу.





Турападобныя быкі Хека ва ўрочышчы Рагі за вёскай Пагост у наш час

Побыт насельнікаў Тураўшчыны не пакідае нікога абыякавым, бо тут захаваліся архаічныя абрады і звычаі, рамёствы і промыслы, своеасаблівая архітэктура і побыт. Хоць жыхары Тураўшчыны адносяцца да Усходняга Палесся, самі яны палешукамі сябе не называлі, а лічылі такавымі сваіх усходніх і паўднёвых суседзяў. У адрозненне ад палешукоў яны маюць традыцыйную назву “замшукі” (якія жывуць за мохам, гэта значыць за балотам). Жыхароў Турава называлі “тураўцы”, яны адрозніваліся адзеннем, гаворкай, ды і ўсім сваім ладам жыцця. Тут жыло шмат таленавітых рамеснікаў, звезеных яшчэ князем Турам з розных навакольных вёсак.

Узоры майстэрства іх нашчадкаў захоўваюцца ў Тураўскім краязнаўчым музеі, школьных і клубных этнаграфічных калекцыях. Зараз, стаўшы ўжо горадам, Тураў, на жаль, страціў сваё непаўторнае архітэктурнае аблічча, якое праяўлялася ў дэкоры хат, франтоны якіх былі ўпрыгожаны салярнымі знакамі і крыжыкамі, знакамі стралы, а вокны - разнымі ліштвамі. Вясковае асяроддзе Пагоста таксама значна страціла са сваіх этнічных архітэктурных асаблівасцяў. Удалося зафіксаваць апошнія іх праявы на фота:


















Рэшткі традыцыйнага драўлянага дойлідства і вырабаў з металу з разьбой у вёсцы Пагост

Вёскі навакол Турава ужо мала захоўваюць узоры традыцыйных народных рамёстваў у сваім асяроддзі. Мастацкая разьба па дрэву ўпрыгожвала некалі калодзежы, агарожы, хаты ва ўсіх вёсках Тураўшчыны. Засталося нявысветленым, чаму некаторыя салярныя знакі ўяўляюць сабой поўны круг, некаторыя палову, а некаторыя чвэрць. Магчыма, такім чынам пазначалі захад, усход, поўнач і поўдзень. У сістэме сядзібы будынкі размяшчаліся ў пэўным парадку: хата-сенцы-сцёпка-павець-хлявы-адрына, клець і свіран, лёхі нярэдка будавалі насупраць жылля. Вакол хаты рабілі прызбу. Двары былі пагонныя, вяночныя(замкнутыя) і Г-падобныя.













Экспанаты Тураўскага краязнаўчага музея і некаторых этнаграфічных куткоў у клубах і школах

### ***Светач***

Хаты асвятляліся светачам (або лучнікам, комінам), ад якога адыходзіў лейкападобны дымаход з палатна, абмазанага глінай і пабеленага. Праз адтуліну ў столі дым выходзіў на гарышча. Такі традыцыйны свяцільнік выконваў не толькі практычныя, але і абрадавыя функцыі. Перш чым распачаць традыцыйныя попрадкі пасля засевак азімых у верасні, спраўлялі абрад першага запальвання святла ў хаце — “Жаніцьба Коміна”. **Такі свяцільнік разам з гэтым абрадам – адзін з этнічных маркераў жыхароў Тураўшчыны.** Менавіта таму гэты абрад захаваўся на Тураўшчыне. Абрад “Жаніцьба Коміна” са сваімі рэгіянальнымі асаблівасцямі існуе толькі ў вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна і ў вёсцы Дзяржынск Лельчыцкага раёна. Жанілі Комін з жаночай працай па вырабу адзення ў зімовую пару – пры ім жанчыны пралі і ткалі, а мужчыны плялі пасталы, кошыкі, рамантавалі сеці, майстравалі посуд і дзіцячыя цацкі з дрэва. Ва ўяўленні людзей год дзяліўся на 2 паловы – лета і зіма. Лета было прысвечана працы на зямлі, а зіма – вырабу адзення і абутку ў хаце пры агні такога светача.



Засеўкі азімых



Каласкі – атыбут усіх абрадаў



Абрад “ЖаніцьбаКоміна” ў Пагосце





Комін або светач падчас абраду. Свяцільнік упрыгожвалі барвінкам, хмелем, кветкамі, абсыпалі гарбузовымі семкамі.





У гэты дзень пачыналі запрадаць, хоць жаночая праца на агародах яшчэ працягвалася.




У Любанскім раёне Мінскай вобласці не захаваўся абрад першага запальвання святла ў хаце, аднак захаваўся звычай запальваць яго апошні раз вясной на вуліцы і кідаць на бярозу пасмы ільну. Жыхары Тураўшчыны памятаюць, што першы раз Комін жанілі пасля восеньскіх засевак азімых, а апошні раз — вясной на фаміным тыдні.

### *“Па адзенні сустракаюць”*

**Яшчэ адзін этнічны маркер жыхароў Тураўшчыны – рагатыя галаўныя ўборы, звязаныя з культам быка тура**. У розных населеных пунктах яны былі розныя па форме і способах навівання. Іх вывучыла з 90-х гадоў ХХ стагоддзя мастацтвазнаўца Марыя Віннікава, падрабязна апісала і замалявала спосабы навівання. Да гэтага часу вывучае і апісвае гэтыя галаўныя ўборы ў навітым стане, якія былі прывезены з Тураўшчыны і захоўваюцца ў музеях Санкт-Пецярбурга, зрабіла рэканструкцыі і ўвесь час іх папулярызуе.

Яна адзначае: “Нашэнне рагатага галаўнога ўбора ва ўсходне-славянскіх народаў было звязана з уяўленнем пра яго магічна-абярэгавую функцыю. У беларускай міфалогіі рог… сімвалізуе не толькі моц, абароненасць, а і плоднасць, дабрабыт. Пра што сведчаць калядныя песні: “Дзе каза рогам —там жыта стогам... У беларускай калекцыі Музея антрапалогіі і этнаграфіі, у Расійскім этнаграфічным музеі такія ўборы, вывезеныя з Турава, Альшан, Запясочча і іншых вёсак захаваліся ў навітым стане, што дало магчымасць іх вывучаць і зрабіць рэканструкцыі такіх рагатых галаўных убораў”.



Жыхарка Давыд-Гарадка



Тураўлянка



Адзін са спосабаў навівання







Рэканструяваны мастацтвазнаўцай Марыяй Віннікавай “рагаты” галаўны ўбор.
Рагатую форму стварае спецыяльная шапачка -каркас. На яе надзяваецца чапец, які зверху павязваецца сарпанкам (гэта тонкая, як марля, саматканая наметка тыпу ручніка).



Адзін з аўтэнтычных жаночых строяў з такім галаўным уборам (яго называюць “галовачка” або “галава”) захоўваецца ў в. Цераблічы Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ў музеі, створаным народным майстрам Беларусі, мастаком і разьбяром, краязнаўцам Іванам Супрунчыкам.

***Гаворкі Тураўшчыны***

Жыхары вёсак у наваколлях Турава называюць сваіх паўднёвых суседзяў палешукамі, а палешукі іх — замшукамі. Тураўскія легенды звязваюць паходжанне гэтай назвы са словам “замак”. Аднак лінгвісты тлумачаць іначай: замшукоў ад палешукоў аддзяляе вялікі лясны масіў з мохавымі балотамі, і жывуць яны ў бязлесай паласе, значыцца, замшукі — тыя, хто жыве за мохам. Сапраўды, палешукі (Убарцкае Палессе, Лельчыцкі раён) маюць свае асаблівасці ў гаворцы, абрадавай культуры, адзенні, звычаях і побыце. Жыхароў Турава называюць “мяшчане”, бо раней казалі не “горад”, а “места”. Тых, хто жыве ў сёлах, — селюкамі. Тураўцы былі прыжымістыя, пра іх казалі: “З тураўцэм знайся, но хаты не паказвай” (бо калі прыйдуць у госці, то тыдзень не выжэнеш, але ж калі да іх зойдзеш, то і вады напіцца не дадуць). А яшчэ, аналізуючы нораў тураўцоў і палешукоў, селюкі папярэджвалі: “Не бяры карову з Палесся, а жонку з Турава” (бо карова з Палесся любіць лясную пашу, а тут паша палявая — будзе наравістая, не перайначыш, тое ж і з жонкай).

Кожнае сяло, які і кожны жыхар, на Тураўшчыне мае сваю агульную мянушку. Прыкладна, тых, хто жыве ў Борках, клікалі “оўдоды” (ад птушкі удод), чарнічан — печурыцы (бо такія грыбы чарнічане бралі вакол сяла, якія ў іншых сёлах і за грыбы не лічылі), пагосцкіх людзей — булахоўцы (бо тут жылі актыўныя хлопцы, якія ўстанаўлівалі свае парадкі: добрую дзеўку са свайго сяла нізавошта не пускалі замуж у другое сяло, а благую стараліся выправіць хутчэй; самі каралі вінаватага, разбіралі спрэчкі), жыхароў Бечы — “машок”(бо яны так вымаўляюць слова “мяшок” — у іх няма якання, але і адметныя рысы жыхароў маглі быць высмеяны гэтым словам — самі, што мяшкі), сямурадцаў — “загваздкі” (слова азначае спецыяльны шпень, які ўстаўляецца ў дзірку калёснай восі, каб не спадалі колы, адносна людзей — тыя, што ствараюць перашкоды, замінаюць), старажоўцаў — “тоўкачэ” (бо тупыя людзі былі, так іх дражнілі), з вёскі Рычоў — “верчэ” (імі круцяць, хто як хоча), хто са Слепцаў (зараз Знаменка) — клікалі “гнілюкі”(гэтым словам называлі грушы-гнілушкі, а ў Слепцах даўней жылі сляпыя і іншыя калекі), хваенскіх людзей называюць “клешчы” (бо жывуць у лесе, і самі, калі ім што трэба, — увап’юцца, як кляшчы, і даб’юцца свайго) з Хачэня — “шляхціцы”, Верасніца было вялікае сяло, іх празвалі “кітайцы”, а Запясочча — “пляхі” (слова азначае “складкі ў страўніку ў каровы”, якія выкідаюць вон, бо ні на што не годныя) і інш.

Пра мянушкі ёсць анекдот. Прыйшла адна баба ў школу, каб спытацца, як вучацца і паводзяць сябе яе дзеці. Пытаецца ў дырэктара: “Як тут мае Куя, Дуда і Марэ?”. Дырэктар здзіўляецца: “У нас такіх няма”. Засмяялася баба і кажа: “Гэта ж іхнія клічкі такія: Колю празвалі Куя, Івана – Дуда, а Васіля — Марэ. У сяле, як не скажаш клічку, то не пазнаюць, пра каго пытаеш”.

Усё гэта запісана са слоў Кацярыны Панчэня з в. Пагост. Раней цікавых апавядальнікаў — захавальнікаў вуснай спадчыны вёсак — было шмат, а цяпер вялікая рэдкасць, калі чалавек карыстаецца сваёй гаворкай, захоўвае вусныя формы фальклору. З аднаго боку, вялікі ўплыў рускай мовы праз экран тэлевізара, які толькі займае час, але не развівае творчыя здольнасці і памяць параўнальна з непасрэднымі зносінамі паміж людзьмі. З другога боку, мода на ўсё гарадское: моладзь цягнецца за тымі хто пераехаў у горад і карыстаецца рускай мовай. У выніку гаворка многіх сучасных жыхароў Тураўшчыны збеднела, колькасць слоў зменьшылася, ужываецца шмат русізмаў. Для таго, каб хоць трошкі захаваць тураўскую гаворку, трэба змалку вучыць дзяцей мясцовым формам фальклору — спеўнага, вусных форм, прыцягваць да ўдзелу ў абрадах, праводзіць конкурсы апавядальнікаў.

Калі мы гаворым пра Тураўшчыну як этнічны мікрарэгіён Усходняга Палесся, важна вызначыць яго межы. І ў гэтым плане нам дапамагае 5-томны “Тураўскі слоўнік”, дзе пералічаюцца вёскі гэтага мікрарэгіёна: у Жыткавіцкім раёне — Азяраны, Буразі., Бярэжцы, Верасніца, Дварэц, Запясочча, Крэмна, Любавічы, Малое Малешава, Вароніна. Пагост, Рыдча, Рычоў, Сямурадцы, Старажоўцы, Тураў, Хачэнь, Хільчыцы, Чэрнічы; у Столінскім раёне — Аздамічы, Альгомель, Альпень, Альшаны, Велямічы, Кароцічы, Лутকі, Вялікае Малешава, Мачуль, Рамель, Рубель, Сямігосцічы, Талмачава, Хотамель, Цераблічы.

Асаблівасці гаворак у гэтых вёсках і адлюстраваныя ў слоўніку. Дарэчы, яго складальнікі падрыхтавалі і выдалі таксама “Лінгвістычны мікраатлас Тураўшчыны” — чарговае значнае выданне лінгвістаў, прысвечанае такому цікаваму, самабытнаму этнічнаму мікрарэгіёну. У гэтых выданнях зафіксаваны асаблівасці маўлення жыхароў у розных вёсках Тураўшчыны.

***Адзін з каменных крыжоў Тураўшчыны захоўваецца ў вёсцы Пагост***

Адно з паданняў звязвае назву вёскі Пагост з часам нападу туркаў – як бы тут затануў турак, а за Сцвігай закапаў клад. А яшчэ ў гэтай назве людзі чулі водгаласак традыцыйных спрадвечных ярмалак на Узвіжанне, калі ў вёску прыплывалі чаўны з усёй Тураўшчыны. Пра гэта расказвалі продкі, а некаторыя старажылы захавалі з дзяцінства ўспаміны пра тое, што ў кожнай хаце на Ўзвіжанне начавалі госці – сваякі, знаёмыя і незнаёмыя. З гэтых даўніх часоў закладзена традыцыя гасціннасці пагосцкіх людзей. Таму назву вёскі тлумачылі яшчэ ад слова “госці”. Госці прыплывалі са сваімі таварамі, каб абмяняцца ўраджаем: з Палесся прывозілі сушаныя грыбы і ягады, з Гарадной — гліняныя гаршкі, міскі, кубкі, гарлачы, свістулькі для дзяцей, з Давыд-Гарадка — чобаты і кажухі, з Турава – крамныя тканіны. Але галоўнае было — пакланіцца цудатворнаму каменнаму крыжу, святыні гэтага краю, бо ён быццам бы першым прыстаў тут да берага сярод іншых тураўскіх каменных крыжоў, што прыплылі супраць цячэння з Кіева пасля хрышчэння Русі ў X стагоддзі.

З успамінаў жыхара вёскі Пагост Германа Фёдара Рыгоравіча, якія запісаны на мясцовай гаворцы ў 1984 годзе і змешчаны ў кнізе “Памяць”, Мінск, 1994 год: “ З колісьнёго так росказваюць: Тоды ў селе екіх тры роды було. Осеньнёе ночы камённые крэсты по рэцэ плылі, тры брацьця іх плыло, не меньш. Да проці ж воды. Одзін проці Семурэдзец увазнёсса, другі проці Пагоста, трэці проці Турова. Удзень людзі агледзелі ёго да на собе ў цэркоў занеслі — вона ў концэ села стояла, дзе зарэ клуб, коло Тура. Аж крэст за ноч назад явіўса. Поп пабачыў да сказаў: «Ето божы крэст. Трэ цэркоў нову зробіць, дзе вон увазнёсса». Зробілі людзі цэркоўку дзераўяну кругом каменя, з куполом, алтарэм. Поп посьвеціў. А над рэкою на шпілю зробілі крэст на подставі, метры на поўторы... Сталі людзі наеждаць кажын год к стому дню. Ето шчыталося «Уваздвіжэнне»; уздвінуцца ўсе людзі сюды на поклон Чэсному Крэсту. Наеждало, шо божэ мой! Возамі, лодкамі, пехотою шлі... з Пінска, з Городка, з Лельчыц, Петрыкова, Мозыра, з ўсёго свету. По 20—30 чоловек начавала ў кожнай хаці, покотом на подлозі спалі. А колькі ў селе хатоў? Раненько ў вялікой цэркві служаць, і йдуць селом к Каменной Божой Мацеры. Дзьве божых мацеры по тры чоловекі неслі, два звонары, малые корогі по одному чоловеку несло. Ідуць, а звоны звоняць. Зайдуць у цэркоўку. У правым вуглу, к сонцу Чэсны Крэст стоіць, свечкі коло ёго гараць. Велікі-велікі крэст, человек п’яць подымалі. Як бы на чоловека выдае: і голова, і плечы, і рукі ў ёго, а ўнізу ек стоўп. Цоловалі Чэсны Крэст коло грудзей. На ёго навешаюць, шо божэ мой! І краму, і палотна, і хвартукоў!.. Прынесе хто хустку, шо вона сто рублей варта. Не шкодуе... Шо обхорошаць ёго! І грошы — не копейкі. Покладзе, так покладзе!.. Ярмолок буў кругом цэркоўкі. Петрыкоўцы — чоботы, городчукі — жэлезяц’е, туроўцы — крам, полешукі — грыбы сушаные, чорніцы. Усе було, усе, шо на сьвеці е…”





Крыж у пост і на свята ва Усясвяцкай царквеТурава і гэтая царква ля ўрочышча Перадол



Каменны крыж ля Кафедральнага сабора сваціцеляў Кірыла і Лаўрэнція Тураўскіх у Тураве.

У 1784 годзе на сродкі чарговага ўласніка вёскі Пагост Салагуба была збудавана драўляная Сціхвінская царква (разбурана ў 30-я гады барацьбітамі з рэлігіяй). У гэты ж час была разбурана на могілках і драўляная капліца, дзе захоўваўся цудатворны каменны крыж. У 1985 годзе для яго захавання быў узведзены цагляны храм “Узвіжання Жыватворнага крыжа Гасподняга” каля могілак ва ўрочышчы Дзедава Даліна, дзе ён знаходзіцца і зараз.





Крыжа-Ўзвіжанская царква ў Пагосце і каменны крыж, які захоўваецца ў ёй.





Купал Сціхвінскай царквы

Капліца на пагосцкіх могліцах, дзе захоўваўся каменны Часны крэст.




Царква ў Пагосце і каменны Часны крэст (Каменная Божая Мацер),
як яго называюць мясцовыя жыхары.

## ***Жаночыя рамёствы ў вёсцы Пагост***






Ільноапрацоўка, прадзенне і ткацтва — гэтым,  як і іншымі рамёствамі, валодала кожная жанчына ў Пагосце.






Кожная жанчына ўмела, але не кожная славілася як майстрыха, рукадзельніца, гаспадыня на сваім падворку і агародзе, кухарка.






Захоўваючы старажытныя ўзоры з рэчаў у хаце работы сваёй маці і бабулі, майстрыхі захоўвалі сваю традыцыйную культуру.







Не абміналі і моду. Калі з'явілася вышыўка гладдзю і неабходныя для яе ніткі,
жанчыны сталі ўпрыгожваць хату яркімі ўзорамі.






Тканыя і вышытыя рэчы з карункамі, дэкор мужчынскіх і жаночых сарочак з вёскі Пагост
(Музей старажытнабеларускай культуры)





Удзельніцы фальклорна-этнаграфічнага гурта "Міжрэчча" самі майстравалі для ясябе традыцыйныя строі.





Кожная спявачка была адметнай майстрыхай, гаспадыняй у хаце, захавальніцай традыцый у сям'і і на вёсцы.




"Без Бога ні да парога" — пагосцкія людзі заўсёды шанавалі праваслаўную веру продкаў і народныя традыцыі.





Некалі ў вёсцы было шмат спевакоў, музыкантаў, танцораў, майстроў народных рамёстваў сярод мужчын.





На змену старэйшаму пакаленню прыходзіць моладзь. Дзеці тут удзельнічаюць ва ўсіх традыцыйных абрадах.

У вёсцы Пагост, дзякуючы намаганням Кацярыны Панчэні, стваральніцы фальклорна-этнаграфічнага гурта "Міжрэчча" (існуе з 1980 года), захавальніцы культурна-гістарычнай спадчыны сваёй роднай вёскі, існуе комплекс сямейных абрадаў і звычяў, святаў і абрадаў народнага календара, характэрных для этнічных традыцый Тураўшчыны, багата адлюстраваны ў фільмах, тэлеперадачах, фотарэпартажах.

***Народны фальклорна-этнаграфічны гурт "Міжрэчча" вёскі Пагост***



Пагосцкая Берагіня — Кацярына Панчэня
(1941-2023)

Кацярына Аляксееўна Панчэня нарадзілася ў сям'і слыннага гарманіста, майстра на ўсе рукі Аляксея Конанавіча Кузьміча. Казалі: "У цябе, Конанавіч, гармонь — як у некаторых вялікіх скрыпка Страдывары". Гэты інструмент музыка заказаў у 1947 годзе на Тульскай музычнай фабрыцы, куды яму мясцовы калгас выпісаў камандзіроўку на цэлы месяц. У хаце Аляксея Конанавіча праходзілі вясковыя вячоркі, збіраліся спявачкі, якім Каця ўжо падлеткам паводзіла, бо мела добры слых і голас, хутка запамінала тэксты. Яе маці, бабуля і амаль усе сваякі спявалі, сярод сваякоў было шмат музыкантаў, у тым ліку яе браты Васіль і Міхаіл, а потым і ўласныя сыны Анатоль і Генік сталі гарманістамі. Як і іншыя падлеткі, Каця ўдзельнічала ва ўсіх абрадах і сцэнічных пастаноўках у клубе.

Сям'я Кузьміч
(з дзецьмі – маці і бацька)



У маладосці Кацярына Аляксееўна шмат дзе працавала, а ў 1980 годзе ёй прапанавалі пасаду дырэктара мясцовага клуба, пасля чаго яна сабрала спявачак і музыкантаў і стварыла фальклорны гурт, які дырэктар пагосцкай школы Васіль Нічыпаравіч Маркевіч прапанаваў назваць "Міжрэчча". Рэпертуар гурта быў цалкам мясцовы, да таго ж, Кацярына Аляксееўна палічыла неабходным захоўваць і падтрымліваць усе абрады і звычаі сямейных традыцый і святы гадавога кола.





Музыкі ад мала да вяліка і ў розны час



"Міжрэчча" удзельнічае ў тэлеперадачы "Запрашаем на вячоркі", аўтарам і вядучым якой быў Васіль Ліцвінка. З гармонікам справа — сын Кацярыны Аляксееўны Анатоль, пасярэдзіне зверху – сын Генік, а злева зверху на фоне печкі яна сама.

Гурт "Міжрэчча" праславіў сваю вёску ва ўсім свеце, пабываў у розных куточках Беларусі, у Мінску, Маскве, у Германіі, у расійскім Вялікім Ноўгарадзе. У Пагост за песнямі і паглядзець на дзіўныя мясцовыя абрады прыязджалі не толькі навукоўцы і студэнты, аматары фальклору, журналісты, тут здымаліся дакументальныя фільмы і тэлеперадачы, прыязджалі ў тым ліку і замежныя журналісты і госці. Апошнія гады ў пагосцкі клуб прыязджае шмат турыстаў, нягледзячы на тое, што многія спявачкі пайшлі з жыцця, а дзеці раз'ехаліся на вучобу або ў пошуках працы.



Гурт "Міжрэчча" падчас здымкаў дакументальных фільмаў "Дачка Прыпяці" і "Кола часу" у 2012 годзе.




Гурт “Міжрэчча” на гастролях у Берліне і Дрэздане, Германія.



У 2018 годзе кіраўніком гурта “Міжрэчча” стала Ірына Ціханаўна Торчык, якая нарадзілася ў 1976 годзе ў вёсцы Старажоўцы, з 1998 па 1996 гады жыла з бацькамі ў Расіі, затым вярнулася ў родную вёску, дзе выйшла замуж, нарадзіла дзяцей  і заўсёды жыла з песняй. Пагост прыцягнуў яе ўвагу сваёй архаічнай культурай, багаццем мясцовага песеннага і танцавальнага рэпертуару, абрадавымі традыцыямі. За 10 кіламетраў яна штодня на веласіпедзе або пешшу хадзіла на працу, а затым пераехала з сынам у Пагост. Выдатная кулінарша, майстрыха-вышывальшчыца, спявачка, носьбіт мясцовых традыцый, яна з цягам часу стала  памочніцай, пераймальніцай рэпертуару і таленту Кацярыны Аляксееўны Панчэні. Пашыла і аздобіла вышыўкай шмат традыцыйных жаночых, мужчынскіх і дзіцячых строяў. Разам з былым дырэктарам клуба-бібліятэкі Ірынай Іванаўнай Юнчыц сабрала ў пагашчан вялікую калекцыю традыцыйных самаробных прылад працы, посуду, мэблі, аздобленага вышыўкай і карункамі традыцыйнага тэкстылю, керамікі, плеценых кашалёў, абутку і адзення, стварыўшы ў клубе этнагафічны куток. Сюды з задавальненнем прыязджаюць з розных мясцін Беларусі турысты, каб пазнаёміцца з побытам славутай вёскі, яе культурнымі традыцыямі, адчуць гасціннасць мясцовых людзей, якія з радасцю дзеляцца назапашаным, стараюцца праз інтэрактыўныя формы пагрузіць на некаторы час людзей рознага ўзросту ў багатую вясковую культуру. У клубе сабраная вялікая калекцыя фота-, відэа-, аўдыяматэрыялаў, кніг і публікацый у часопісах і газетах пра вёску Пагост, яе гісторыю і культуру, а таксама матэрыялаў пра этнічныя традыцыі іншых вёсак Тураўшчыны. Вёска з яе традыцыямі стала базавай школай і месцам практыкі для студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва, якія атрымліваюць спецыяльнасць кіраўнікоў фальклорных калектываў. Безумоўна, клуб-бібдіятэка ажыццяўляе і іншую работу, як падобныя ўстановы культуры на сяле, але новыя формы працы цяперашні дырэктар клуба і кіраўнік гурта “Міжрэчча” распрацоўвае і ажыццяўляе дадаткова і ад усёй душы, бо разумее вялікую каштоўнасць спадчыны вёскі Пагост.








Не раз пабываў гурт у сталіцы Расіі, дзе выступаў перад беларусамі Масквы.








2022 год, Вялікі Ноўгарад, дзе пагосцкія спявачкі — Кацярына Панчэня, яе нявестка Наталля Марозава і кіраўнік гурта "Міжрэчча" Ірына Торчык атрымалі гран-пры на Пятым міжнародным фестывалі-конкурсе нацыянальных культур і фальклору "Усе народы ў госці да нас".

### *Абрады і звычаі гадавога кола ў вёсцы Пагост*

Звычай памінання продкаў-мужчын адбываецца ў пятніцу вечарам 12 поснымі стравамі, а продкаў-жанчын – раніцай 12 скаромнымі стравамі, сярод якіх разам з мяснымі падаюцца малочныя стравы. Такім чынам, памінальная вячэра ў пятніцу ў Пагосце і ўвогуле на Тураўшчыне называецца Дзяды, а ў суботу — Бабы. Абрадавыя стравы — гэта канун (каржы з мёдам) і куцця з тоўчанай пшаніцы з мёдам. Абавязкова трэба спячы свежы хлеб, каб з яго ішла пара, а таксама тонкія бліны і пірог (круглы хлеб з пшанічнай мукі), кашу з проса падаюць апошняй. Выправоджваючы дзядоў і баб, тройчы ліюць ваду пад стол. Са стала не прыбіраюць, а дзядоўскую міску назаўтра ставяць на страху. Продкаў памінаюць на гаду 4 разы — перад Міхайлам 21 лістапада, перад Масленіцай, Тройцай, а таксама на могліцах на Вялікдзень (адзіныя скаромныя Дзяды для памерлых мужчын).





Дзяды і Бабы ў сям'і Кацярыны Панчэня. За сталом яе нявестка і спявачка гурта "Міжрэчча" Наталля Марозава і ўнук Міхаіл, апошні з чатырох дзяцей яе сына Анатоля, якіх яна гадавала пасля яго смерці. Анатоль патануў у Сцвізе, ратуючы свайго малодшага сыночка Анатоля, не стала абодвух.





Калі ў сям'і быў тапелец, то назаўтра стравы, якія адкаладалі і адлівалі ў дзядоўскую міску, неслі на ваду

Песні, танцы, музыка суправаджалі жыццё продкаў змалку да апошніх гадоў жыцця. Музыкантаў у Пагосце было шмат, спявачак таксама. Не дзіва, што ў 1980 годзе, калі Кацярыне Аляксееўне прапанавалі стаць дырэктарам клуба, яна стварыла вялікі фальклорна-этнаграфічны калектыў, які назвалі "Міжрэчча" (абазначаючы, што яны жыхары вёскі ў міжрэччы Прыпяці і Сцвігі). Гэты калектыў і захаваў тыповыя рысы традыцыйнай культуры Тураўшчыны ў Міжрэччы Прыпяці, Сцвігі і Гарыні.



Гурт "Міжрэчча" на Раство



Традыцыйныя маскі на Шчадрэц



Саламяны павук




Абрад у апошні дзень Масленіцы "Гу, вясна!", калі пачынаюць заклікаць вясну песнямі.

  

Саракасвятых (Саракі) 22 сакавіка . У гэты дзень пякуць 40 жаваронаачкаў
і падкідаюць іх на саматканым абрусе, а дзеці ловяць.

Сярод усіх абрадаў і святаў народнага календара найвялікшым лічыцца абрад “Карагод” на свята Юр’я 6 мая. І не толькі ў Пагосце, але і ўсюды на Тураўшчыне. Пасля агледзінаў азімых і ваджэння карагода ў полі адбываецца юраўскае валачобніцтва па вёсцы.

*Фотаздымкі з архіва Р.С.Гамзовіч*

*Матэрыялы для сайта Тураўскага краязнаўчага музея падрыхтаваны ў рамках праекта “Рэалізацыя плана ахвы вясновага абраду “Юраўскі карагод” в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, уключанага ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова” пры падтрымцы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)*
*Больш пра праект:* https://living-heritage.by/unesco/yura-sk-karagod/

*У рамках праекта падрыхтавана навукова-папулярнае выданне: Нематэрыяльная культурная спадчына Тураўшчыны : анталогія / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Фонд нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ; рэдкал. : А.Т. Каліноўская, А.Б. Сташкевіч, А.В. Гумінская. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2023. – 184 с. : іл.*
*Электронная версія выдання апублікавана на сайце “Жывая спадчына Беларусі”:*
https://living-heritage.by/publications/Anthology_ICH_Turau_area_2023.pdf